Беларускі Звон

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9). Рэдакцыя адчынена: 12—2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Рукапісы павінны быць напісаны чытальна і толькі па адным баку паперы, з праўдзівым прозьвішчам аўтара і адрэсам для ведама Рэдакцыі). Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага належыць ад Рэдакцыі.

Цана кожнага нумару 50 м. Падпіска на 3 месяцы каштуе 600 м. (з даст. да хаты) Цана абвестак: перад тэкстам 700 мк., сярод тэксту 300 мк. і на апошняй страніцы 120 мк. за радок пэтыту у 1 шпальт.

Год II. | **Вільня, Пятніца, 15-га верасьня 1922 г.** | **№ 19 (44).**

Вясковыя Камітэты!

Арганізацыя выбараў ужо пачалася. Скрозь па вёсках народ завіхаецца, каб на дзень выбараў у Сойм (5 лістапада) і ў Сэнат (12 лістапада) стануць дружна, як сьцяна, і выбраць такіх людзей, якія запраўды будуць бараніць наш народ.

У гэты першы пэрыяд арганізацыі мы павінны ўглядацца на тое, каб ніводная воласьць, ніводзін абвод не асталіся без сваей арганізацыі, без свайго камітэту. І вось чаму.

Першае — тое, што розныя чужыя нам партыі і людзі старающца ўзяць нашых сялян у свае рукі і пакіраваць на выбарах так, што мы і не агледзімся, як пападзем у няволю да паноў.

Гэтак і будзе, калі мы ня створым сваей арганізацыі па усіх паветах, валасьцёх, абводах і вёсках.

Другое — гэта тыя дзьве работы, якія выпадаюць на долю выбарных камітэтаў. Мы ўжо пісалі, што першая работа — дапільнаваць, каб усе беларусы, якія маюць права голасу, былі ўпісаны ў сьпіскі выбаршчыкаў. Другая задача — гэта ўжо ў дзень выбараў.

Вось-жа ў кожнай вёсцы ў дзень выбараў камітэт павінен мець у руках гатовыя нумары беларускага сьпіску і даць кожнаму выбаршчыку. Камітэт павінен дапільнаваць, каб уся вёска — усе, хто мае права голасу, — узьняліся грамадой і ўсе пайшлі ў выбарнае бюро падаваць голас. Камітэт павінен быць павадыром вёскі, павінен дагледзіць, каб варожым сілам не ўдалося ні гарэлкай, ні пужаньнем, ні юдавымі срыбнікамі адцягнуць нашых сялян ад выпаўненьня іх грамадзкага абавязку.

Вось задачы камітэтаў.

Няхай-жа ўсе, хто зразумеў гэта, прыложыць сваю руку да арганізованасьці. Няхай ніводзін жывы чалавек у вёсцы не адхіляецца ад сваей грамадзкай павіннасьці.

Малішэўскі.

Беларусы!

Панскія найміты і розныя правакатары ўжо заварушыліся, каб за ўсялякую цану разьбіць адзіны беларускі выбарны фронт.

Імёны іх вядомы нам і будуць апубліковауспы.

За грошы з брудных крыніц яны стараюцца купіць сумленьне ўсялякіх вырадкаў, што на ганьбу нашаму народу носяць імя беларускае.

БЕЛАРУСЫ!

Ведайце, што ўсе запраўдныя сыны народу, ўсе байцы за волю яго бяз розьніцы партый згуртаваліся ў Беларускім Цэнтральным Выбарным Камітэце, які знаходзіцца ў Вільні.

Памятайце, што кожны, хто будзе старацца адцягнуць народ ад гэтага кіраўнічага цэнтру,— гэта здраднік і слуга паноў!

Памятайце, што панскія агенты будуць падыходзіць да вас, прыкрываючы свой твар Юды рознымі заманчывымі іменьнямі!

Гуртуйцеся каля Беларускага Цэнтральнага Выбарнага Камітэту, закладайце свае валасныя Камітэты, злучайцеся ў павятовыя і акружныя і чакайце паведамленьня, за які сьпісак павінен падаць голас кожны беларус.

Нумар сьпіску апублікуе Беларускі Цэнтральны Выбарны Камітэт.

Прэзыдыум Беларускага Цэнтральнага Выбарнага Камітэту.

Нашы грамадзянскія хваробы і лекі на іх.

Калі хоць крыху ўважней прыгледзімся да нашага грамадзянскага жыцьця, дык знойдзем там дужа многа рознага роду хвароб, балячак і недамаганьняў; разам-жа з імі ўбачым усю нашу бязсільнасьць, каб ад гэтай грамадзкай пошасьці ратавацца.

Першай такой хваробай беларуса і наагул тутэйшага хлебароба, ёсьць справа зямельная.

Ужо некулькі гадоў, як Варшаўскі Сойм прыняў закон аб зямельнай рэформе. Ці добры геты закон, ці ён сапраўды мае на мэце дабро працоўнага люду, дык гета яшчэ вялікае пытаньне. Але аб гэтым цяпер не гаворым.

Які закон гэты ёсьць, то ўжо іншая рэч, але які і ёсьць, дык і той у жыцьцё ня ўводзіцца. Сойм цяперашні, як ведама, панскі; і таго закону аб зямлі, якім ён ёсьць, паны не хацелі. Закон гэты ў Сойме прайшоў прыпадкам, бо што стаялі за рэформу зямельную, ставілі большасьць толькі адным голасам аб тым, што гэтага не хацелі. А калі хоць адным голасам закон прайшоў, дык паны пастанавілі ўсё роўна зямлі не даць. Пастанавілі і зрабілі. Прайшло ўжо некалькі гадоў, а рэформа наперад не пасоўваецца. А калі што і робіцца (хоць дужа мала), дык для польскіх сялян, а для нашага тутэйшага земляроба ня робіцца добрага нічога. Наадварот, робіцца яму самае зло, бо адымаецца ад яго зямля і раздаецца чужынцам. Такім чынам робіцца нам вялікая гістарычная крыўда. Жаліцца-ж няма каму, бо гаспадаром зяўляецца Сойм, а нашых там няма. Знача, **лекарствам на гэту вялікую, цяжкую хваробу ёсьць прад усім правесьці ў будучы Сойм сваіх людзей,** каб яны пратэставалі процiў гэтай страшнай польскай палітыкі, палітыкі, што забіраець ад нас нашу ўласную зямельку. А спыніўшы гэтую колонізацыю, каб пасла нашы скранулі хоць раз зямельную рэформу з месца і стараліся зрабіць здабыцьцё зямлі даступным. Дзеля гэтага паслом нашым трэба будзе старацца, каб таму, хто зусім бедны, зямля была дана дарма, таму, хто можа заплаціць, цана была даступная, каб плата магла быць разложана на раты. Грошы з гэтага выкупу, каб усе паном не аддаваліся. Патрэбная камісія з прадстаўнікоў ураду і мясцовых самаўрадаў, каб вырашыла, што пану належыцца, а што і не. Пэўнаж, таму нічога не належыцца, што ўжо пасьпеў прадаць ці зямлі, ці лесу, ці лугу, або таму, хто са сваей прафэсіі мэець сабе хлеб. Выручаныя-ж грошы павінны ісьці на падмогу тым новым гаспадаром, якія атрымаюць зямлю і пачынаюць ўжо гаспадарыць, а ня маюць за што і рук зачапіць, бо ані каня, ані каровы, ані снасці. **Аб усім-жа гэтым скуткоўна і сапраўды шчыра змогуць клапаціцца толькі нашы ўласныя паслы.**

Але, як кажуць, пакуль сонца ўзойдзе, дык раса вочы выесьць. Так і тут, **пакуль скранецца з месца справа зямельная, то ты бедны чалавеча цярпі, ды цярпі, бо усё будзь і будзь на ласцы і няласцы пана.** Бо калі ты арэндатар, дык пан мaець сто і больш спосабаў як з цябе скуру садраць, а калі ты так патрэбуеш заняць у пана зямелькі, ці ўзяць на запаску, дык і тут твая праца бадай што ўся пойдзе на пана, бо ён такую цану заваліць, або такую часьць зажадае, што табе і за працу ці астанецца. Дык вот-жа і тут змогуць памагчы працоўным толькі свае паслы ў сойме, бо з іх голасам і паны будуць рахавацца, бо будуць ведаць, што ў сялянiна ёсьць заступнікі, якія ведаюць усе патрэбныя дарогі.

А іншчэ ёсьць адна хвароба, якая нас страшэнна душыць; гэта **адсутнасьць самаўрадаў і поўнасьць чужынцаў на пасадах і рожных установах.** Як цяжкой гэта несправедлівасьць ёсьць для нас хваробай, мы ўсе дужа добра ведаем. Дзеля такога палажэньня мы нат і ў сваей гміне не гаспадары. І сюды нам прысылаюць рожных чужых прыблудаў, якія займаюцца шпiёнствам і даносамі, а для нашых людзей, для прыяцеляў працоўнага тутэйшага люду, бо для яго сыноў, месца няма аніўгміне, ані ў іншай якой установе. Раз тутэйшы, раз беларус, дык табе няма месца. А калі сяляне дзе адважацца і напрыклад за старшыню гміны выбяруць свайго, парадачнага чалавека, дык староста паветавы яго скінець і назначыць якога панскага прыхвостніка, як гэта нядаўна было ў гміне Пагадзкай і Залескай Дзісэнскага пав. Ад такогаж бязпраўя мы, ня маючы сваіх паслоў у сойме, не абаронімся ніколі. Яно вечна будзе нас душыць. **Толькі нашы паслы здолеюць адваеваць нам праўдзівы самаўрад, дзе мы самі гаспадарылі б і дзе нас не ашуківалі.**

Наканец, вылічаючы гэтыя нашы грамадзкія хваробы, няможна не звярнуць увагі на **недахват нам сваей роднай беларускай школы.** Свая родная школа, гэта — будучына наша, будучына краю. Толькі праз школу сваю родную зможам мы быць вольнымі грамадзянамі ў вольным краі, толькі праз родную асьвету здолеем перамагчы ўсе цёмныя сілы, якія жыць нам не даюць. Чужая ж школа калечыць дужа нашых дзетак, абкрадае гэту душу, баламуціць дзіця і прыгатаўляе з яго не нашых прыяцеляў і абаронцаў, а нашу ганьбу і згубу, бо з чужой школы выходзяць звычайна адступнікі і здраднікі сваго працоўнага народу. С чужой школы, гаворачы коратка, выходзяць людзі, аб якіх добра гаворыцца, што хоць і свая костка, але як абрасьце чужым мясам, дык сьмярдзіць. Дык вот—жа ворагі нашы паны разумеюць гэта добра і дзеля гэтага не даюць нам сваей роднай школы. Яны кажуць: набярыце 40 вучняў і бацькі хай падпішуцца, што жадаюць беларускай школы, а гміна хай на гэта згодзіцца, дык і можна. Ага, гміна! А ў гміне-ж пасаджаны з нарок або пан, або паўпанок, або наняты шпіён, якія з усіх сіл стараюцца, каб не дапусьціць беларускай школы, ня гледзячы на тое, што люднасьць гэтага жадае. Выходзіць, што воля люднасьці цалком мусіць залежыць ад волі панскай. Гэта хвароба так сама страшенная, балючая. Вылячыцца з яе мы самі ня здолеем. **Толькі нашы ўласныя паслы змогуць памагчы нам і ў гэтай хваробе,** бо яны дойдуць туды, куды нам не дайсьці.

Дык, Сяляне, памятайце аб гэтым і галасуйце за свой беларускі тутейшы сьпісак.

А. Сярмяга.

Перад выбарамі.

Прадстаўнікі Блёку нацыян. меншасьцяў у Старшыні міністраў.

Прадстаўнікі Блёку нацыянальных меншасьцяў былі ў старшыні Міністраў і зложылі яму мэмор'ял у справе нарушэньняў правоў пры састаўленьні сьпіскаў выбаршчыкаў, з якой прычыны большая частка насяленьня так завомых „крэсаў“ пазбаўлена будзе права голасу. Старшыня міністраў абяцаў зрабіць усё магчымае, каб выбары прашлі правідлова, без усялякіх нарушэньняў.

Прадвыбарная „Свабода“.

Самавольства. На прошлым тыдні, нейкая паненка, запісываючы грамадзян да выбароў, зьявілася да

Беларуская інтэлегенцыя, сяляне і работнікі, рыхтуйцеся да выбараў, трэбуйце, каб незапісаных запісывалі у сьпіскі выбаршчыкаў!

аднаго беларуса і заявіла яму, што яна яго ўпіша толькі тагды, калі ён дасьць падпіску, што будзе галасаваць за польскі сьпісак. Тлумачэньні беларуса не памаглі. З тым і пашла.

✦ У горадзе Вялейцы палічываецца 15 падпішчыкаў „Белар. Звону". Ня гледзячы на тое, што ім пасылаецца газэта самым акуратным парадкам ніхто з іх, у працягу ўжо чатырох месяцоў, не атрымаў ні аднаго номера. Ма быць ёсьць „poufny" загад, які быў калісь дадзены і аб «Нашай Думцы».

Дзікі небывалы спосаб барацьбы!

✦ Аўдзей В., сябра Белар. Цантральнага Выбар. Камітэту, па няведамай для нас прычыне, на днях арыштаваны віленскай паліцыяй.

Зьезд прадстаўнікоў Белар. Выбар. Кам. ў Горадні.

У Горадні 5 IX-22 г. адбыўся зьезд прадстаўнікоў акружных і паветовых Беларускіх выбарных камітэтаў з акругоў: Горадзянскага, Астроўскага і Беластоцкага. На парадку дзенным было: 1) Адносіны да блёку і 2) А кандыдатах.

Па першаму і другому пытаньню прынята аднагалосна пастанова.

1) Прыймаючы пад увагу, што створаны блёк нацыян. меньшасьцяў, мае на мэці абарону супольных інтарэсаў народнасьцяў проці несправядлівасьці зробленай выбарным законам — прылучыцца ў гэтым пытаньні да Беларускага Цантральнага Выбарнага К-ту ў Вільні і весьці супольна працу.

2) Веручы, што інтарэсы беларускіх працоўных мас, змогуць абараніць яго шчыра дэмакратычныя прадстаўнікі, дамагацца, каб кандыдатамі ў Сойм былі выстаўлены асобы—змагальнікі за справу нашага сярмяжнага люду, за яго лепшую долю, за волю і зямлю.

✦✦✦✦

Хто можа быць выбаршчыкам, як састаўляюцца сьпіскі выбаршчыкаў і як бараніць свае правы выбаршчыка.

Самая важная праца ў пачатку выбарнай чыннасьці гэта ёсьць састаўленьне сьпіска выбаршчыкаў.

Трэба памятаць, што да галасаваньня будуць дапушчаны толькі тыя, хто правільна ці неправільна запісаны ў акачальна ўжо зацьверджаныя сьпіскі. У сьпіскі запісываюцца толькі поўнапраўныя грамадзяне-выбаршчыкі.

Хто можа быць выбаршчыкам.

Выбаршчыкамі данага абвода (вучастка) зьяўляюцца ўсе грамадзяне і грамадзянкі Польскае Рэспублікі, якім да 18 жніўня г. г. споўнілася 21 г., інакш кажучы, якія радзіліся да 19 жніўня 1901 г. і якія жылі ў гэтым абводзе ў дзень 17 жніўня г. г., якія ня служаць у войску і ня былі засуджаны судам. Лічым патрэбным заўважыць, што аб апошнім пункце выбарны закон шмат гаворыць і даць тлумачэньні ў інструкцыі дужа трудна.

На выпадак, калі ўлада пачне рабіць перашкоды і не захоча запісаць у сьпіскі ссылаючыся на судовую ганьбу, трэба неадкладна зьвярнуцца за парадай ў бліжэйшы Белар. Выб. Камітэт, які калі не сам, дык праз Акружны Белар. Камітэт дарадзіць у гэтай справе.

Мы жывём у часе гістарычных зарірух, перанясьлі некалькі акупацый і пераносім страшную плутаніну прававых адносін у краі. Ясна, што за гэты час панішчаны бадай усе кнігі запісяў насяленьня.

Большасьць сялян жывець калі ня зусім без дакумэнтаў дык мае іх выдадзеныя рознымі акупантамі, і гэтыя дакумэнты ў вачох улады не вялікую маюць вартасьць.

Што да новых дакумэнтаў, дык яны выдаюцца вельмі асьцярожна і з вялікім палітычным расчотам. Разабрацца ў усіх гэтых дакумэнтах будзе не так лёгка і зразумела, што варожыя нам беларусам адзінкі пастараюцца выкарыстаць нашае няведаньне і назлачыняць пры выбарах. Як яркі прыклад адзначым, што ў г. Бярэсьці з палавінай жыдоўскага насяленьня налічываецца толькі 6 асоб, маючых правы польскага грамадзянства і права галасаваньня. Усе распаражэньні і інструкцыі апубліканыя да гэтуль кажуць:

1. Выбаршчыкамі з'яўляюцца ўсе, хто жывець настаянна ў межах Польшчы. Пастаянным жыхаром Беларускіх зямель лічыцца той, хто быў занесяны ў гарадзкія ці вясковыя кнігі, хто быў запісаны ў кнігі яшчэ пад уладай расейцаў, усе яны маюць права галасаваць. Калі ўсе сьляды доказу пастаяннага жыхарства зьнішчаны, дык даказаць свае права на галасаваньне можна старым расейскім пашпартам, новай польскай легітымацыяй, вайсковым білетам ці мэтрыкай. Нямецкі пашпарт ня прызнаецца за доказ.

Яшчэ можна даказаць сваё права на галасаваньне згодна ст. 35 п. 5, што калі няма зусім ніякіх дакумэнтаў, дык даволі калі ўся вёска пасьведчыць, што жалабшчык сапраўды ім вядомы і мае права галасаваць. Апрыч таго можна толькі прадставіць двух сьведкаў, якія павінны прысягнуць аб праўдзівасьці заявы заінтарэсаванага. Калі-ж месцовая ўлада пачне рабіць перашкоды, ня гледзячы на вышэйшыя доказы, дык не адкладна трэба з жалабай зьвярнуцца да бліжэйшага Беларускага Выбарнага Камітэту.

Правы польскага грамадзянства мае яшчэ і той, хто да 7 верасьня 1920 году быў на дзяржаўнай польскай службе. Беларусы, прыбыўшыя з Расеі маюць права выбаршчыкаў толькі тады, калі яны згодна Рыскага міру атрымалі правы польскага грамадзянства пасьля свае й аб гэтым заяве;

II. Апрыч таго на абшарах быўш. Сярэдняй Літвы—паветы; Віленскі, Сьвенцянскі, Троцкі і Ашмянскі—грамадзянамі Польшчы лічацца тыя 1) хто ў названых паветах жыў ня менш 5 гадоў да вайны—да 1 жніўня 1914 г. ня служачы на дзяржаўнай службе, 2) хто да 15 студня 1291 г. меў няруахмасьць у названым раёне і жыў тут з 1 жніўня 1919 г., 3) хто жывець тут з 1-га студня 1918 г. і 4) хто да 15 жніўня 1921 г. быў на дзяржаўнай службе ці па самаўпраўленьню ў назв. раёне.

Пры гэтым ёсьць агульнае права, што жонка карыстаецца правамі мужа. хоць бы яны асабіста і ня мела права галасаваць.

Састаўленьне сьпіскаў.

Сьпіскі выбаршчыкаў павінны быць у ўсіх гмінах састаўлены і прадстаўлены Абводавай Камісіі, якая разгледае і праверае з тымі матэрыяламі, з якіх былі састаўлены сьпіскі і зацьверджае іх. Сьпіскі павінны быць выстаўлены для агляду не пазьней 15 верасьня ў працягу 2-х тыдняў—да 28 верасьня уключна. Сьпіскі павінны быць вывешаны па ўсіх вёсках і сядзібах. Дазваляецца разглядаць сьпіскі, рабіць з іх выпіску толькі б іншым не перашкаджаць (ст. 35, п. 2.) Камісія павінна аб'явіць аб гадзінах, калі сьпіскі можна аглядаць.

Кожны выбаршчык павінен пайсьці ў Камісію і паглядзець ці ён і яго знаёмыя запісаны. Калі не запісаны дык мае права і павінен заявіць аб гэтым у камісію вусна ці лепш пісьменна і абавязкова з сваей падпісяй, патрэбуючы ўнясьці яго ў сьпісак. Гэтую заяву ён павінен патрэбаваць запісаць у пратакол камісіі і прасіць заразжа прачытаць і падпісаць самому толькі тады, калі ён пераканаіцца, што

Адрывак з повесьці „За што?"

Ці давадзілася вам праяжджаць па вёсцы ў канцы лета, калі нітачкі прыгожага засмучэньня ужо снуюцца нявідна і незлавіма ў цёплым паветры паўдня, ужо вяшчуюць восень?

Ціха ўсё, бязмоўна і бязьлюдна. Шэрым цихамірным пылам пасьцелена пустая вуліца. На гародзе, за абціснутым плятнём, схіліў да сонца жоўтую, з махрамі кружэлачку высокі слачешнік. Абсыпаець чорна-чырвоныя пялёстачкі добры мак ужо запозны, і зьвініць дасьпелымі мачнікамі, у зубчатых карунках, буйнейшымі і дробнымі на тонкіх шызых сьцебялінках.

Дзеці за доўгі дзень насеклі з крапівы і макрыцы сечанкі сьвіньням; спаўзалі ў чужую рэпу і яблыкі; пакачалі кацелку і пабілі ёю стараставу шыбу; паскрыгаталі, аглушаючы, калёскамі па вуліцы, возячы малога; пабіліся, улашчыліся; дапалі да паніклага сланешніку і неўзнаку выскублі паўкружэлачкі. Зрабілі з паловак мачын лыжачкі і будуць гуляць „у прычасьце" або ў „госьці". Натрусяць у падалы кашулёнак маку і пачнуць паднасіць „гасьцём"—яго і яшчэ „перапечкі", — семя праскурак, што ў дастатку і густа парасьлі ў дзядзькіным садзе, на вуліцы пад плотам і пад сьцяною, разам з сабачаю мятаю.

Мляўкім і войстрым нечым пояць канаплі паветра. Уссунуў дзед-даматур, што нічога ня варты ні ў касе, ні навет у граблях, а пільнуець двара, дзяцей і пчол, усунуў даўгую пляшку на худыя, сагнутыя жыцьцём плечы ў дзіравым жупане і панёс яе па канаплянай сьцежцы да гумна—сушыць асець жыта: заўтра бо ў іх малацьба сёлятняга ўраджаю. Гэты дзед — поэта ў душы, і вельмі ўлюбіў пару году сярод лета і восені, калі надыходзіць нявыразны пярэкрут усей уроды да адміраньня, калі ўсё расьціннае дасьпявае сыплець насеньне, дбаючы аб патомстве, і з ціхай пакутай ці-то пакорай спрадвечнаму жоўкнець, хіліцца. Любіць дзед іці аб гэтай пары па сьцежацы сярод зялёнай пушчы канапеляк, якія тхнуць сваім п'яным араматам і патроху прадзіраюць свае вочы. Любіць любавацца на фарботы залаценькай павучыны, што бліскаюць на сонцы, цягнуцца, нібы-то плывуць ай сьцелюцца ад поля (гдзе пажата і пусьцеець) на гароды (гдзе густа і поўна, і сьмягнець, і ўсыхаець), і дальш на чорныя гоні, гдзе незабавам зачырванеець рунь. Любіць дзед, расклаўшы цяпло пад асецьцю і паплакаўшы ад елкага, з пахам прэлай гуменнай зямлі, дыму, доўга-доўга сядзець і бавіць час ля палыхаючых дроў і грэць старыя косьці. Карціць старому пакласьці ў попел колькі бульбін і ўглядаючыся на агонь — вэкавечнае, успамінаць, як быў маладым хлапцом (як, во, ўнукі) пасьвіў коні ў позную пахмурную восень, клаў пад лесам з пасохлага вербалозу і бярозавых пянушкоў вялічэзнае цяпло і пёк бульбу, а калі было сала, дык і сала прог на важашку, крутка падстаўляючы скібку хлеба, каб не сьцякаў Божы дар на зямлю. Успамінае дзед, і часам глынець, але маець на думцы, што стар, і дзяржыцца паважнасьці. Ат, усё роўна: нявестачка старанна хаваець ключ ад клеці, гдзе і сала таго ледва на затаўку да стравы. Як быў дзед ў парэ, а жылі замажней, ужываў і дзед у волю хлеба з салам, змалаціўшы да раньня асець жыта. Была пара! Але дзед — поэта, і ня надта яму цяжкія раўнаваньні розных часоў жыцьця свайго; во, хваліць Бога за печаную бульбу і магчымасьць сядзець ля агня і думаць аб жыцьці; і рымсьціць, пакуль палахлівы ўнучак затупаець па таку босымі ножкамі, падбяжыць бліжэй і захныкаець: „Дзядуля! А, дзядуля! Ці ты тута?" Дзедка памаўчыць, ацылі ў часе пакашляець і нібы сярдуючы адгукнецца, — павошта ныні хлапчук-гарэза прыбег; пільнаваў-бы саду і боб ад кур, усе струкі зьдзяўбалі, гадаўкі. Тады здоймець яго да сябе на спод і дасьць крупянай, сыпкай, і, маўляў, цукер, белай і гарачай бульбачкі. І пачне без канца пераказаваць унуку, як жыў у пана пасэсара ў батракох, вазілі яны сала на продаж аж да Вязьмы; ў дарозе пяклі бульбу ды варылі кулеш пад чорнай дзяругай летнай ночы абы-дзе край леса.

Сонца борзда закоціцца, а дзеці ўздумалі пірагі пячы. Накапалі ў ямачцы гліны, ў чарапочку замясілі і на ўслончыку цалюткі рад наляпілі к сонейку „пірагоў". Дзяўчонкам прыкра, што ў кумпанію ўбіўся хлапчук. Ен ня лепіць вялікіх і невялічкіх піражкоў, як тое вядзецца ў добрай гаспадыні, а пачынае галузаваць, вырабляць конікаў і бязхвостых цюпек. І дзяўчынкі усякчыста псуюць яму работу.

Ах, гэтыя прашкоды вольнай творчасьці поэта ў лепшую пару яго жыцьця, пару маленства!

Пара, аб якой ня варта забывацца. Хто счарцьвеў, пагінуў у будзённшчыне, — у дзяціныя гады быў вялікім музыкаю, граючы на йскрыпачцы з лучынак і са струнамі з нітак. І даўлела яму, быў змысел. Хто зрабіўся тупы, як палка, — у гады маленства з палкі вырабляў мастацкія для яго мастацкіх пачуваньняў штукі: птушачак, зьвяроў, і сьвятыя расьпяцьці. Надышлі гады жыцьцёвага амбарасу і згвалтавалі сьвятыя радошчы, затушылі бліскучую іскрачку ў шэрым попеле, растапталі дыямант у пабітым шкле, з поэта вырабілі быдліну. Жыцьцё, жыцьцё! Мы ўсе нараджаемся хто песьняром, хто скульпторам, а хто сім ітым патроху. Мы ўсе ў гады прашнаваньня душы — рэфарматары і будаўнікі лепшай соцыяльнасьці, знамянітыя прапаведнікі ці добрыя разбойнікі, але жыцьцё нічагусенькі не пакідае нам і робіць жалаблівымі старцамі.

Ці траплялася вам бываць на вёсцы ў гэткі час, калі пуста ў ёй пад пякучым сонейкам, усе людзі на полі сярод аўса і лёну, што жаўцеець і галубеець?

Ціха вясковая вуліца. Пасвулі сланешнікі і макі. А ніводным пазалочаным лісткам не варухнуць яблынкі ці сьліўкі. Сярод гальля і лісьця бялеюць і чырванеюць яблыкі, а пасьпелыя сьліўкі густа сплятухаліся і вісвуць, чорныя к долу.

Ці здаралася вам у гэткі пагодны, сярод лета лета і восені дзянёк быць у вёсцы і трапіць на ўскрай хат, туды, гдзе хацінка галяка ўехала ў зямлю, вокны яе, з пабітымі балонкамі, запхнуты насьпех лахманамі і сядзяць на самай загавальні.

Бліэка хаткі тырчыць адзінота- рабіна з [illegible] кімі пучкамі чырвоных ягад. На макаўку [illegible] зьвісаець шмат саломы са страхі. Комін [illegible] лавіну разбурыўся і скрануўся набок пад ця[illegible] шчарбатага гаршчка і рыхтуецца рассыпацца з[illegible]

Прадавілася на пуні страха, і ніхто яе [illegible] ўздымаець і не папраўіць, як бы няма каму парупіцца аб тым. Мо' ў шынку загуляўся гаспадар?

Беларусы, закладайце Выбарныя Камітэты, станьце у абароне сваіх правоу!

ў пратаколе запісана тое, што ён хацеў. Калі Камісія запатрэбуе дакумэнтаў, дык трэба даказаць ім свае права на галасаваньне адным з паказаных вышэй спосабаў. Тут трэба заувважыць, што сам закон (ст. 35 п. 5) патрэбуе доказаў толькі ў выпадках надзвычайных. Напрыклад, калі вёска падпьверджае, што вы маеце права выбаршчыка; дык Камісія ня мае права адказаць запісаць у сьпісак. А калі адкажыць, дык трэба склікаць сход, які падпьвярдзіць вашую правамочнасьць. (ст. 35 п. 5.)

Аб унясеньні ў сьпісак трэба патрэбаваць ня толькі сябе, але сьлядзіць і аб сваіх суседзях, і знаёмых, каб так сама былі ўнесяны.

На ўсе заявы Камісія павінна неадкладна зрабіць дапаўненьні ў сьпіску.

Калі Камісія прызнае няправільнасьць заявы, дык таксама, павінна вывесіць для агульнага ведама сваю пастанову і неадкладна аб гэтым павядаміць заінтэрасаваную асобу.

На пастанову Камісіі кожны выбаршчык мае права за сябе і за другіх выбаршчыкаў падаць жалабу ў Акружную Кам. Жалабу трэба падаваць праз Абвадовую Кам. пад расьпіску яе прадстаўніка. Жалабу трэба падаваць у працягу трох дзён ад дня ўручэньня пацярпеўшаму пад расьпіску павесткі ад Камісіі аб тым, што выбаршчык ня мае права галасаваць.

Не пазьней 9 кастрычніка Абвадовая Камісія перасылае папраўлены і дапоўнены сьпісак выбаршчыкаў у Акружную Кам. з усімі пратэстамі і жалобамі. І ўсёткі яшчэ да 13 кастрычніка ўключна Абвадовая Камісія павінна прымаць жалабы і неадкладна высылаць іх у Акружную Камісію.

Аб абароне права выбаршчыка перад Акружной Кам. пагутарым пасьля.

Дарагоўля.

Дарагоўля на ўсё расьце з кожным днём. Польская марка ўсё танее. Сто марак сталі дробнымі грашовымі білетамі. Тысячныя і пяцітысячныя ўжо неўмешчаюцца ў кешані звычайнага ўрадніка, атрымаўшага пэнсію. Бугальтэры каравул крычаць ад цыфраў, бо ўсё трэба ўжо лічыць на мільёны.

Адбываецца нейкая чахарда: цэны павялічываюцца на прадукты,—рабочыя і чынавенства трэбуюць надбаўкі платы; надбавюць плату — растуць цэны на прадукты, павялічываюцца розныя падаткі; і так без канца. Станкі ў Польшчы ўжо няўсьпеваюць друкаваць паперовыя грошы. Хутка тысячныя і пяцітысячныя стануць дробнымі грашмі, а ў хаду зьявюцца, мусі быць, 25.000, 50.000, 100.000, а пасьля не загарамі будуць і мільёны, бо эвалюцыя дарагоўлі ў нас не астанаўліваецца. Вось прыклад:

у 1919 г.	1 ф. хлеба каштаваў	—	40 ф.
„ 1920 г.	„ „	—	15 м.
„ 1921 г.	„ „	—	40 м.
цяпер	„ „		120-150 м.

І няма ніякіх даных аб тым, што з часам зьменіцца, што эвалюцыя дарагоўлі астановіцца; наадварот апошнія часы дарагоўля расьце ўсё шыбчэй і шыбчэй.

Ці не напамінае гэта тую катастрофу, якая не так даўна была ў Расеі і цяпер адбываецца ў Аўстрыі? А калі гэта так, дык паўстае пытаньне, што-ж чакае ў будучыне наш край?

Хвалёны вольны гандэль у Польшчы аслабіць крызіс ня ўсілах. Дзякуючы дзіўнай палітыцы польскіх кіруючых кругоў, на чале якіх увесь час стаялі: пан, капіталіст, фабрыкант і спэкулянт, каапэрацыя, якая б магла значна аслабіць крызіс у Польшчы, ў большасьці мае толькі вывеску за якой хаваецца шовінізм. З незалежнай каапэрацыяй вядзецца барацьба і яна руйнуецца.

Шмат грошы траціць Польшча на сваю армію, бо неўстанавіўшы граніц з суседзямі і дрэнна жывучы і з немцамі, і з літвінамі, і з расейцамі, яна змушана трымаць вялікую армію і траціць на яе вялікія грошы. Барацьба з украінцамі ў Галіччыне, з немцамі—у Шлёнску, ў нас: з беларусамі, літвінамі, жыдамі і расейцамі—таксама вымагае страшэнна вялікія грошы, на шпіанаж (тайную паліцыю) і наружную паліцыю. Замест таго, каб пачаць барацьбу з найвялікшым ворагам дзяржаўнасьці—эканамічным растройствам і дарагоўлей, Польшча вядзе барацьбу ў сябе дома з ўсімі народамі, якія ня лічуць сябе палякамі; палянізуючы іх усіх, а ў нас яшчэ крыўдзючы сялянства каланізацыяй, нажывае ворагаў на кажным кроку і стварае з сваей дзяржавы другую ласкутную дзяржаву, якой некалі была Аўстрыя і якая развалілася пры першым удары. Унутрэньняя барацьба мае вынікам тое, што цяпер ідучы па вуліцы спатыкаеш праз дваццаць пешаходаў аднаго паліцэйскага. Тое самае і на вёсцы.

Адміністрацыйны апарат Польшчы страшэнна бюракратычны і вялікі. Усё зроблена нібы для таго, каб даць пасаду страціўшым маёнткі панам і панскім сынам.

На гэткае ўпраўленьне краем ідуць страшэнна вялікія грошы.

Будучаму Сойму, на выбары якога ўсе беларусы павінны пайсьці, асталася сумная спадчына. Яму абавязкова трэба будзе заняцца ўпарадкаваньнем эканамічнага стану краю, бо калі гэта зроблена ня будзе, дык край можыць лёгка дажыць да цяжка эканамічнага стану з якога выкараскацца будзе не так лёгка.

Пу—га.

Самазванства.

Гэтымі днямі выйшла з друку расейская кніжка „Огнем и мечем, голодом и болезнями“ Е. Ладнова, каторую вядомы расейскі пісьменьнік Філософов ахарактэрызаваў, як чарнасоценскі брэд найгоршага гатунку. Ня гледзячы на тое, што аўтар гэтага „знамянітага“ твору родам беларус, мы не зьвярнулі-б на яго ўвагі, калі-б ня тое, што на ёй пастаўлены надпіс, што гэта—выданьне Варшаўскага Беларускага Камітэту.

Такі падпіс як бы даець чарнасоценскаму выступленьню пана Ладнова грамадзкі характэр. Вось-жа выясьняем, што Варшаўскі Беларускі Камітэт ужо даўно перастаў істнаваць. Фірмай камітэту зусім бясправўна карыстаецца грам. Дубейкоўскі, быўшы старшыня яго, і, як бачым, гэтак нягодна паганіць імя беларускае дзікім чарнасоценствам.

Выясьняем гэта, каб людзі, ня ведаючы праўды, ня прыпісывалі беларускаму грамадзянству ўчасьця ў паганым выступленьні ненармальнага чалавека.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

М. Ільля, Вялейскага павету.

З месяц таму назад да нас, у мястэчка, прыеджалі агітатары ад партыі „Вызваленьня“. На мітынгу яны дужа грамілі паноў, чыноўнікаў, якія не выпаўняюць канстытуцыі, а вядуць сваю эндэцкую палітыку, прыгнетаючы працоўны народ. Народу падабалася гэтая гутарка агітатараў, але толькі дзівіліся чаму пра беларусаў яны, як бы знарок, маўчаць. У нас усе жыхары беларусы і усе хацелі-б паслухаць сваіх агітатараў беларускіх, асабліва гэта трэба цяпер перад выбарамі ў Сойм і Сэнат. Трэба беларусу ў роднай мове громка сказаць чаго дабіваюцца беларусы і што нам патрэбна.

Зьмітра.

Мяст. Казяны Дзісенскага пав.

У нашым мястэчку ў ліпні месяцы быў кірмаш. Гаспадары, сабраўшыся ля воза завялі гутарку аб сенакосах, аб пагодзе. Гэта зьвярнула ўвагу паліцэйскага Галубоўскага, які стаў чапляцца да грамады гаспадароў, каб разыходзіліся. Пачалася сварка. Неўзабаве падышоў камэндант паліцыі і некалькі сялян было арыштована простаткі за нішто, а Мікалая Камінскага дык зьбілі шомпалалі за тое, што ён меў „аружжа“ — складаны ножык. Бацьку арыштаванага Атрахімовіча, камэндант ударыў два разы стрэльбай і той зранены паваліўся без чуцьця. Арыштаваных павялі ў Глыбокае і няма каму за іх уступіцца. Вось хіба як выбярым свайго чалавека ў Сойм, дык праз яго сьвет пачуе аб нашых крыўдах.

Сьведка.

Наша вёска.

Сумна і жудасна робіцца, як прыгледзішся цяпер да нашай вёскі. Год таму назад вёска жыла. З прагавітасьцю лавілі сяляне ўсялякія навіны, чы-

---

А можа б'ецца, як тая рыбіна аб лёд, здабываючы штодзенны хлеб, але няма яму ўдачы! Прадраліся плятнёвыя сенцы, і скрозь іх відаць кабыя дзьверы, падпёртыя знадворку каромысьлікам і таўкачом. Значыцца, нікога ў хаце няма. Але падзівуемся. Калі вашы вочы паслабкі, і, апрача адбітку свайго ўласнага носу і зялёнай цямноты нічога, не разгледзяць, вы ня трэбуйце і ня бойцеся запэцкаць рукі і ўпіхніце лахманы. У дзірку бухнець з хаты важкае смуроднае паветра. Адхіліце на мінутку голаў і ўзноў зірніце: цяпер вам не ашукацца ў цемні шкла...

Што можна ўвідзець ў хаце гаротнага мужыка-беларуса?

Высокі, пад самыя абразы, стол, вузкі і хісткі; на ім падаўна ня вымыты абрус, склычаны комам ці зьвісаючы рогам на лаву. Зірніце на пол. Не, гэта ня логава сьвіньні, ня птукатнік, кудою содзяць кур ды гусак несьці яйкі. Гэта ўсклычаная канапляная сувалка і бярамца саломы; гэты чорны ад бруду важкі, спляжены і прагнілы, сьмярдзючы сяньнік; гэты груд усякага шкумацьця, усланага сьмяцьцём, з парай кінутых дзяціных кавярзеньчыкаў-лапцей; усе гэта — магнацкае ложа для зманежанага працаю, спацелага мужыка і яго вужэлкаў-дзяцей. Ча' вам дзівіцца на закапцелыя шосьцікі і палічкі, гдзе бабскія сховы? Нічога, апроч таго-ж рызьзя і сьмяцьця, ня ўвідзім. Няцікава і старавечная наша бабулька--печ, аграмадная, са шчэрбамі ў чалесьніку, з вышчэрбленым загнетам і подам, з разварочаным пяколкам, наша унівэрсальная печ, паўнюткая гаршчкоў з пракісаючай на вячэру ежай і сохнучых ababкаў. Асела яна, старая, на струпехлых грубых балясінах, прыгнёўшы хвароcьце пад-печчам і нейкія мётлы і гальні; і калі доўга прадзержыцё яе пад недаверчывым, крытыкуючым поглядам, яна, з Божай ласкі, загрыміць цэглай і падавіць усё, што пад ёю і ў ёй: хвароcьце, і крупеньню, і ababкі. Там, далей, у місачным куту, лапатачкі-лыжкі, нямытыя міскі і даёнкі, і ўсялякі хлам. Усё гэта няжывое, нямаючае болю, — і даўно прышоў час шпурнуць яго бабскаю рукою за прасла або ў незакапаную яму з-пад старога паграбнішча.

А вы зірніце на жывое. Яно сярод хаты на земляной падлозе, зьбітай у ямкі і залітай памыйкамі, сядзіць на кучы кійкоў і бляшанак патурэцку ля місы з рулямі хлеба, пастаялкі і бруду. Круглыя дзяціныя вочачкі, зарумзаныя і пахмурыя, з безнадзейнай недаўменасьцю уталопяцца на вас. І патроху паяўляецца сьвядомасьць: чаго вам трэба? Бо вы — ня матка, што зачыніла яго, ня маючы большых дзетак-нянек, і зышла на дзень-год у поле жаць авёс, ня йдзець пакарміць яго і абцерці саднячы насок. Вы разважаеце: хлопчык ай дзяўчынка? Ня маець вагі — доля аднакова.

Вось — герой нашае гісторыі Хомка.

Вось — яго дзугіная пара.

Безнадзейная недаўменасьць пачынае паволі зьнікаць і пераходзіць у тужлівае расчараваньне: ня маці, а чужынец, брат-чалавек, бязуважна пазірае на бяду малога. Пакутна ападаець хударлявенькая, брудная, з мала прыкметным цьмяпажоўтым пагульцам дзяцінай пульхасьці ручка і апяшала кідаець вялізную лыжку ў міску з малаком. Адылі сьціскаецца ў кулачок, падносіцца да воч, і ўзноў бясконцае, роўнае, ужо аплаканае за даўгі дзень, галосіць гора:

— Гу-гу-гу... Ма-ма!

Чыё мураванае сэрца не кранецца гэтым восенным даждкжом, гэнай адвечнай музыкай бязвыходнасьці, падобнай да гужа (вераніцы) думак чалавека, што папаліў усё-чыста ў душы сваей і пераказвае словы, здаецца, яшчэ цара Эдыпа: „Што ні будзець—няхай на маю галаву!“

Авохці мне, як гужам вякоў лятаюць словы гэтыя на зямельцы нашай!.. Чуюцца ў гуле дуброў нашых, у посьвісьце ветра, у краканьні варон над непраезнаю дарогаю; у маркатаньні, авечак узімку на сьцюжы ў дзіравай аўчарцы; у трэсканьні лучыны, што маркотна пускаець дым у зімовыя досьветкі; у песьні п'янога дзядзькі, што плятухаецца па калюгах непаладжанай дарогі сярод абы-як абробленых палёў, з курганка ў лагчынку, з долу на ўзгорак, ад гаю да лясочку, да роднай хаты — грудка шэрага гною паміж гэтакіх-жа грудкоў-хат. Ці ня гэтай песьні наўчаліся мы што часіны пад сэрцам матак нашых? Ці не яна, найвялікшая прамудрасьць канаючага, і у нашым першым крыку пры нараджэньні, калі няма чым аддаць сьвяшчэньніку за яго таінства? Пакора бязвыходная і пачуваньне кардонаў іхты, за якія ня выскакнуць а ніколі. Што-б ні здарылася—няхай на маю галаву!

Ці чутна вам, як аб тым-жа шапацяць струпехлыя стрэхі нашых хат, жабы кумкаюць у выгарах-балотах і гудзіць пясочак палёў нашых пад гонам ветру?

Авохці мне!

Вякі—адна і тая песьня.

Гудзець дзіцёнак ў зачыненай хаце, пяець песьню бацькоў.

Ці не маскоўскія князі і баяры, падпіраючы з усходу; турэцкія султаны і пашы, скубучы з паўдня; ляхі-магнаты, хітрыкамі пнучыся з захаду; немцы крыжам ды мечам адылі асьветаю налягаючы з поўначы, з мора; а прыгон, і гандляры, і гарэлка, гнятучы ўпасяродку,—ці не яны выціснулі з народа майго тое гістарычнае румзаньне: што ні зробіцца, а няхай на нашыя галавы?

У зачыненым дзікунскім вігваме кінутае гудзець дзіцянё надарваным голасам, пяець песьню бацькоў.

Во ўзьнялося яно на ножках крывых, пад намоклым падалом кашулёнкі, лубянай адзаду. Уздыхнула глыбока і ўзноў прысела. І падол той, быццам магдэбурская палавіна шару, як звон навокал біла-цельца дзіцёнка. Узяў кіёчак і аглушона забарабаніў ім па бляшанцы з пад газы, што падаравала яго матцы Малка Міхаліха за бабскія паслугі.

— Брынг! Брынг!

А, хэ! Гідкі дзіцёнак, герой наш. У саплях, нямыцька, худы, а жывот яго — як той бубен і выпнуўся ад чорнага хлеба і бульбы.

Максім Гарэцкі.

талі газэты, гаварылі на палітычныя тэмы. Але цяпер вёска заснула. Нейкі чорны туман спавіў яе, штосьці цяжкое навалілася ей на грудзі і прыціснула яе. Закамянела вёска, закамянелі сэрцы сялян. Неяк згорбіўся, сагнуўся селянін, глядзіць на ўсё з-пады лба ні кому няверыць. Калі станеш гаварыць з ім, пачуеш толькі кароткія адказы і згоду яго на ўсё. Ен ніколі ня выкажыць таго, што баліць, ён баіцца; бо былі такія выпадкі, што сышчык з дэфанзывы прыкідываўся яго прыяцелем, выпытываўся ў яго ўсё, а пасьля садзіў у турму, як „палітычнага", каб даказаць што ён нешта робіць. І пакуль разьбіраліся з справай, селянін месяцы двa-тры мучыўся ў турме за нішто.

Сяляне чакалі зямлі. „Ну ня будзець жа так,—гаварылі яны: — хоць на выплату, а дадуць па нейкім кавалку". І чакалі. Але калі ў вадным мястэчку нейкі эндэцкі агітатар хваліўся на мітынгу, што ў Польшчы так добра, без разьліцьця крыві прайшла «зямельная раформа», сяляне ў вадзін голас крыкнулі: „Паночку! дык дадуць зямлі?" — Głupi jesteście!—адказаў аратар: — ktoż darmo co daje? Możecie kupować u pana". Як громам зразіў сялян гэтакімі славамі. Сталі церабіць патыліцы, і ў маўчаньні разышліся.

А паны прадавалі зямлю. Лупілі за яе страшэнныя грошы і ня бралі маркамі, а вымагалі даляраў, збожжа, скаціны. І ці мог бедны чалавек хоць дзесяцінку дастаць зямелькі?

Цёмныя шкадлівыя элемэнты, карыстаючы з гэтага, намаўлялі сялян, каб білі паноў і „кулакоў", каторыя купілі зямлю, каб рабавалі, палілі ўсё. З роспачы народ слухаў гэтых нагаворшчыкаў і йшоў у банды, якія паўсталі ў Вялейскім і Дзісьненскім паветах.

Над усім гэтым пануюць „крэсовыя" князькі — раённыя і войты. Здалёку здыймае селянін перад імі шапку, а калі прыйдзе за справай, цэлую гадзіну стаіць ля парога і трасецца. „Горай, многа горай як пры цары, — шэпчуць сяляне,—дух скора выцягнуць".

І каб затапіць сваё гора, п'юць гарэлку. П'юць страшэнна, бяз меры. Морам ліецца гарэлка. Нейкая гарэлачная чума ахапіла ўсіх. Па мястэчках і навет па вёсках растуць шынкі, якія прыбралі далікатную назву: „рэстаўрацыя". І вось калі пры цары была адна манаполька ў мястэчку, цяпер гэтых «рэстаўрацыяў» штук пяць, дзесяць. А колькі „вінных склепоў", а па большых мястэчках «вінных складаў"?.. У кірмашны дзень па мястэчках пад вечар пагалоўна ўсе п'яныя. Неяк жудасна робіцца, гледзячы на п'яныя постаці. Ноч чорная спавіла ўсё наўкола.

Начальства, замест таго, каб спыніць гэту п'яную агонію, каб прыняць якія меры, само п'ець да азьвярэньня, пачынаючы ад адміністрацыі вышэйшай—старостве і канчаючы абвадовым солтысам.

Сумна на вёсцы...

Нідзе не просьвету. Заснула і сьпіць вёска цяжкім сном!

У. Неўскі.

Уманьскі Беларускі Гурток імяні Максіма Багдановіча.

Арганізаваны з бежанцаў-беларусаў і жыхароў-беларусаў г. Умані (на Украіне) названы Гурток веў культурна-прасьветную нацыянальную працу да вясны 1920 г., да часу, калі на Украіне запанавала Савецкая улада. З гэтага часу Гурток мусіў ліквідавацца, перадаўшы грошы Украінскаму Каап. Банку, а дакуманты і матарьялы, маючыя гістарычную вартасьць, перадаў пэўнай украінскай арганізацыі ў Кіеве і пачаў працаваць як культурна-прасьветная арганізацыя пад наз. „Прасьвета". Але і гэтая арганізацыя была сольлю ў воку камуністычным верхаводам і, праіснаваўшы каля дваццаці месяцоў, была зачынена, а сябры ураду, баючыся розных рэпрэсіі, раз'ехаліся: хто на Бацькаўшчыну, хто ў іншыя месцы Украіны.

Гурток працаваў даволі актыўна, налічываў да 400 сябраў, абнімаў арганізованае беларускае грамадзянства 5 паветаў Кіеўшчыны, арганізаваў Уманьскі беларускі бойскаўцкі гурток „Юнак", падаваў матэр'яльную і маральную запамогу бежанцам і іншае.

С. К.

ХРОНІКА.

→ **Янка Купала і Якуб Колас**, як паведамляюць прыехаўшыя з Менску, моцна занедужалі. Я. Коласу дактары параілі выехаць на вёску і ён цяпер жывець недалека Менску ў адным савецкім маёнтку; Я. Купала выдаў новую кніжку «Спадчына» зборнік перш друкованых вершаў. Абое пішаць мала. З. Бядуля пастараму пладовіты, шмат друкуе сваіх твораў пад разнымі псэўдонімамі ў газ. «Савецкая Беларусь».

→ **Драмат. Майстроўня ў Вільні.** У аўторак, 5 верасьня распачалася праца ў Беларускай Драматычнай майстроўні, якая зьяўляецца сэкцыяй Вілен. Белар. К-ту пом. ахвяр. войны.

Пасьля інфармацыйнага дакладу, які зрабіў адзін з ініцыятараў Майстроўні Мік. Красінскі, быў прыняты плян працы на сэзон 1922—1923 г. Майстроўня паставіла сабе тры мэты: 1) пастаноўка драматычных твораў ў чыста мастацкім напрамку, 2) падгатоўка тэатральных пастановак на вёсцы, 3) падгатоўка моладзі для сцэнічнай працы.

Дзеля выкананьня першае мэты прыняты пакуль што да пастаноўкі гэткія пьесы: 1-ы спэкт. — Я. Купала: „На папасе", „На куцьцю", „Адвечная песьня" (тры абразы); 2-гі спэкт.—Фр. Аляхновіч: „Пан міністар"; 3-ці спэкт. — Гогаль: „Жаніцьба" (перак. Н. Арсеньнявай) і 4-ты спэкт.—Ул. Караленка: „Лес шуміць" (інсцэніроўка Ф. Аляхновіча), Э. Ажэшка: „У зімовы вечар" (інсцэніроўка Власта)

(Сярод прысутных на першым сходзе былі: п. Ф. Аляхновіч, п. Грыневіч, п. Міхалевіч, п. Н. Арсеньнява і іншыя працаўнікі Майстроўні).

Раз'ясьненьне.

Беларуская Цантральная Школьная Рада ў Вільні гэтым даводзіць да ведама сялян беларусоў, што яны, хочучы адчыніць у сябе на мейсцы беларускую пачатковую школу, маюць на гэта законнае права. Гэта права замацована Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай Польскай, (§ 110) маючы на ўвазе культурныя патрэбы сваіх грамадзян, належучых да няпольскай нацыянальнасьці.

Дзеле адчыненьня школы сяляне павінны: 1) давясьці да ведаме войта гміны, што яны ў такі і такі дзень зьбяруцца ў гміне ці ў другім мейсцы на сход дзеля пастановы аб адкрыцьці беларускае школы, 2) напісаць на гэтым сходзе просьбу да Павятовага Школьнага Інспэктара з подпісамі тых бацькаў, дзеці якіх будуць вучыцца ў школе, 3) у просьбе зазначыць, што выдаткі на школу сяляне бяруць на свой кошт, апрыч аплаты пэнсыі вучыцелю і 4) далучыць сьпіс дзяцей ня менш 40. (Калі дзяцей будзе больш чым 50—60, і на гэты лік будзе адпаведаць будынак школы, то ў просьбе можна прасіць вызначыць 2-х вучыцялёў). Вучыцель, каторага сяляне будуць прасіць аб назначэньні, павінен ведаць польскую мову і мець адпаведныя паперы на права выкладаньня ў пачатковай школе.

Копію з усіх, зробленых такім парадкам, дакумэнтаў належыць прыслаць у Беларускую Цантральную Школьную Раду, каб, на выпадак правалочкі справы адчыненьня школы, Рада магла-б яшчэ і з свайго боку падтрымаць просьбу сялян перад Уладай.

Беларуская Цантральная Школьная Рада.

СЯЛЯНЕ! Дамагайцеся сваіх школ у роднай мове. Састаўляйце прыгавары аб адчыненьні беларускіх школ. Зьвертайцеся за парадай і запамогай да Беларускай Цантральнай Школьнай Рады. Памятайце, што ў асьвеце—наша моц.

Новы рэктар Віленскае Праваслаўнае Сэмінарыі.

На гэтых днях у Вільні атрыманы Указ Асьвячонага Сыноду Праваслаўнае Мітраполіі ў Польшчы гэткага зьместу:

„Найасьвячэншаму Элеўфэрыю, Архіяпіскапу Віленскаму.

Асьвячоны Сынод на паседжаньні 30 жніўня 1922 г. слухалі: данясеньне Архіяпіскапа Віленскага Элеўфэрыя ад 22 чэрвеня (5 ліпеня) 1922 г. № 651, у якім ён, адказываючы на Указ Асьвячонага Сыноду № 11 (журнал № 1, ст. 6 ад 16 чэрвеня 1922 г.) прадставіць на пасаду рэктара Віленскае Духоўнае Сэмінарыі асобу ў духоўным сане адмаўляецца гэта зрабіць на тэй падставе, што быццам рэктарам Віленскае Сэмінарыі, і кіраўніцтва Сэмінарыі „чакаюць з кожным эшалонам."

Спраўка 1. Статут аб кіраўніцтве праваслаўнае царквы ў Польшчы, Зацьверджаны Найасьвячэншым Патрыархам, Асьвячоным Сынодам і Вышэйшай царкоўнай Радай, § 2: „Аўтаномія Праваслаўнае царквы ў Польшчы пашыраецца на справы прасьветныя."

Спраўка 2. Сп. абав. Інспэктара Віленскае Духоўнае Акадэміі выпуску 1914 г. Ігумэн Піліп (Марозаў).

Пастанавілі: Маючы на ўвазе, што паадных вестках Архімандрыт Анатоль ёсьць ужо ў сане япіскапа, а па другіх — памёр, але ў кожным разе прыехаць у Вільню ня можа, як ня польскі грамадзянін, і лічучы, такім чынам, тлумачэньне Вашае Найсьвячонасьці не здавальняючым, звольніць ад спаўненьне абавязкаў рэктара Віленскае Сэмінарыі Інспэктара Сэмінарыі В. Багдановіча і назначыць рэктарам Сэмінарыі спаўн. абавязкі Інспэктара той самай Сэмінарыі Кандыдата Багасловія Петрагр. Дух. Акадэміі Піліпа (Марозова) і паставіць яго Архімандрытам, аб чым паслаць Вашай Найасьвячонасьці указ да ведама і выкананьня і паведаміць Уладу, просячы аб даравяньні Ігумэну Піліпу польскага грамадзянста. Пачаеў 31 жніўня 1922 г. № 62. Арыгінал падпісаў: Старшыня Асьвячонага Сыноду Юры, Мітрапаліт Варшаўскі. еп. аб. кіраўніка спраў А. Саковіч. З арігіналам згодна: Дыанісі, Архіяпіскап Валынскі і Крамянецкі.

Будзем спадзявацца, што пры новым рэктары спыніцца старая крыўда для беларусаў — выкладаньне ў Сэмінарыі ў шкодным для нацыянальнага адраджэньня кірунку і сэмінарысты пачуюць крыўду ад сваей бацькаўшчыне і аб сусьветнай навуцы на роднай мове.

Што чуваць у сьвеці.

Цяжкае становішча Грэцыі.

Разьбітыя туркамі грэкі пакінулі Малую Азію. У арміі развал. Кароль Канстанты адказаўся ад трону. У горадзе Афінах забурэньні.

У Лізе Нацый.

На паседжанях, Лігі Нацый, якія цяпер адбываюцца ў Жэневе, галоўнай справай ёсьць пытаньне аб нацыянальных меншасьцях.

Забурэньні ў Індыі.

Газэта „Temps" паведамляе, што ў горадзе Пэнджабе пачняліся вялікія забурэньні.

Колькі абойдуцца выбары ў Варшаве.

Тэхнічная падгатоўка выбараў у г. Варшаве абойдзецца каля 300 мільёнаў марак.

Непарадкі ў Шлёнску.

На грунце паніжэньня нямецкай маркі ў г. Катавіцах адбыліся бурныя непарадкі сярод рабочых.

З Літвы.

Газ. „Kur. Por." паведамляе, аб тым, што літоўцы ўручылі сэкрэтарыяту Лігі Нацый новую ноту проціў палякаў.

Пісьмо ў Рэдакцыю.

Паважаны Пан Рэдактар!

Надоячы „Gazeta Wileńska" зьмесьціла артыкул аб Віленскім Саюзе Каапэратываў, поўны прызвычаенай гэтай газэце бязсільнай злосьці і фальшывых закідаў. Аўтар гэтага артыкула называе паважанага беларускага грамадзяніна Станіслава Чыжэўскага „зьбеларушчаным расейцам", якіх нібы-то „ёсьць многа ў беларускім руху".

Беларускае грамадзянства зазвычай праходзе моўчкі міма падобных лаянак, бо яно ня мае ні ахвоты, ні часу адказываць на ўсякую лухту.

Аднак, самая глухая фальш, калі яна часта паўтараецца, робіцца ў вачох людзкай табалы падобнаю да праўды.

І я лічу на гэты раз абавязкам беларускага грамадзяніна напісаць у „Беларускім Звоне", што „Gazeta Wileńska" перабірае сваю мерку, гаворачы аб грам. Чыжэўскім.

Грам. Чыжэўскі ня толькі вядомы на ўвесь край каапэратар, — ён вядомы беларускі пісьменьнік, каталік па рэлігіі, і прозываць яго „зьбеларушчаным расейцам" прост сьмешна. Хай гэта ведае „Gazeta Wileńska".

14 IX 1922. Л. Родзевіч.

Адрасы Беларускіх Выбарных Каміт.

Цантральны Выбарны Камітэт. Вільня, Віленская № 12.

Акружны Выб. Камітэт на Навагрудзкі акруг, Баранавічы. Паштовая № 66

Акружны Выб. К-тэт на Лідзкі акруг Ліда Легіоновая. вуліца № 1

Акружны Выб. К-тэт на Гарадзенскі акруг. Горадня, Паўночная вул. № 7.

Акружны Выб. К-тэт на Беластоцкі акруг. Ваўкавыск, Пясковая вул. № 14

Навагрудзкі Паветовы Выб. К-тэт. Навагрудак, Вялікі рынак № 14

Бельскі Паветовы Выб. К-тэт Бельск, Літоўская вул. № 30

Несьвіжскі Паветовы Выб. К-тэт Несьвіж Альбянская вул. № 30

Слонімскі Паветовы Выб. К-тэт. Слонім Абалонь № 42

Пружанскі Паветовы Выб. К-тэт Пружаны

Стаўпецкі Паветовы Выб. К-тэт Стаўпцы.

Аўгустоўскі Паветовы Выб. К-тэт Аўгустова

Сакольскі Паветовы Выб. К-тэт Саколка

Сэйнскі Паветовы Выб. К-тэт Сэйны.

Рудомінскі Абводавы К-тэт м. Рудоміна Віленскі павет.

Шаркаўшчызненскі Абводавы К-тэт м. Шаркаўшчына Дзісенскага павету.

Докшыцкі Абводавы Выбр. К-т. Докшыцы, Дунілавіцкага п.

Забрэскі Абв. Выбр. К-т. м. Забрезье, Ашмянскага пав.

Ганчарскі Гмін. Выбр. К-т. Вёска Ганчары, Лідцкага пав.

Беліцкі Гмін. Выбар. К-т. Вёс. Збляны Лідцкага пав.

Орлянскі Гмін. Выбр. К-т. м. Орля Лідцкага пав.

Ржанкоўскі Гмін. Выбр. К-т. Вёс. Ракавічы Лідцкага пав.

Курс на грошы.

(Віленская біржа.)

Офіцыяльна за 14 верасьня.

Нямецкія маркі	4.55
Доляры	6885
10 руб. золатам	34.300

Рэдактар-Выдавец Ф. АЛЯХНОВІЧ.

Друкарня „ДРУК" Субач, 2.